

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№34 (272) 22 — 28 ЖНІЎНЯ 2002Г. НАКЛАД 11.400 ЭКЗ. КОШТ 250 РУБ.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

САЮЗ

МАСКОЎСКІ МЮНХЕН

1938 год. Мюнхен.

У гэтым нямецкім горадзе была падпісана злачынная дамова, якая дала падставу Гітлеру "праглынуць" Аўстрыю і Чэхаславакію і прыблізіць чалавецтва да сусветнай бойні. Нешта падобнае адбываецца і ў наш час.

2002 год. Масква.

Расійскі прэзідэнт агучвае свой план "паглынання" Беларусі. Трагічныя моманты ў гісторыі паўтараюцца. Няўжо з палітычнай карты свету знікне Беларусь — заснавальніца ААН, краіна са старажытнейшым народам планеты, краіна-пакутніца, краіна-партызанка.

Мы павінны ўзняць голас пратэсту супраць гэтых злачынных планаў. Няхай нас пачуе сусветная супольнасць і не дасць здзейсніцца гэтым авантурным задумам. Не Крэмль, а беларусы павінны быць гаспадарамі на сваёй роднай зямлі. Не быць новаму Мюнхену.

Людзі, будзьце пільнымі.

Мікола БАРЫСІК, гісторык

(Працяг тэмы на 12,13 стар.)

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 9[50] 20.08.2002г.

	Покупка	Продажа
"Беларусбанк"		
1 USD	1840	1880
1 EURO	1790	1845
1 RUR	56	59
оао "Белпромстройбанк"		
1 USD	1840	1875
1 EURO	1800	1855
1 ZL	425	455
1 RUR	56,5	59
"Белагропромбанк"		
1 USD	1840	1880
1 EURO	1790	1820
1 RUR	57	59
Нацбанк РБ		
1 USD	1840	
1 EURO	1807,89	
1 RUR	58,31	

СВЯТА

СПАС СА СВЯТОЙ ІКОНАЙ





У панядзелак, 19 жніўня, у слонімскім Свята-Прэабражэнскім саборы праваслаўныя вернікі адзначылі Другі Спас.

У гэты дзень у саборы людзі пакланяліся іконе Ісуса Хрыста. Яе з Арэнбургскай вобласці Расіі прывезла Антаніна Яфімава. Некалькі гадоў назад ікона стала кровата-чыць. З таго часу жанчына возіць ікону па праваслаўных храмах. Са Слоніма ікону павезлі ў Гродна. Адначасова з пакланеннем перад іконаю, прыхажане свянцілі яблыкі і грушы. І наогул, спасаўскія святкі ў беларусаў складаюцца з трох частак: 14 жніўня — быў Першы або Мядовы Спас, Макавей. 19 жніўня адзначылі Другі Вялікі Спас, яго яшчэ называюць Яблычным. І 29 жніўня будзе Трэці Хлебны ці Арэхавы Спас.

У народзе кажуць, што ад Другога Спаса надвор'е становіцца халаднейшым, а, значыць, ужо скончылася лета. Як у той прымаўцы: "Прыйшоў Спас — і лета ад нас".

Сяргей ЧЫГРЫН, фота Віталя ГІЛЯ

ЮБІЛЕЙ

ПРАЗДНИК ГОРОДА ПОТЕРЯЕТ В ЗРЕЛИЩНОСТИ

Несмотря на значимость запланированного на начало сентября события — 750-летия Слонима, — празднование этой почитаемой даты будет не таким зрелищным, как это предполагалось раньше.

Причина – в изменении сроков проведения праздничных мероприятий. Выясняется, что наши районные власти решили совместить юбилей с "Дожинками", что само по себе, безусловно, неплохо. Экономия средств и все такое прочее...

Однако, как стало известно корреспонденту «ГС», в Слоним на праздник не приедут военно-исторические клубы России, Литвы, Беларуси, и слонимчане не смогут увидеть зрелище, давно ставшее популярным в исторических центрах Западной и Восточной Европы, на местах величайших битв начала XIX века. Имеется ввиду – реконструкции боев периода Наполеоновских войн. Хотя предварительная договоренность с униформистами была, что приедут эти фанаты военной истории в Слоним 13-15 сентября. А вот 6-8 сентября все они будут в России на 190-летии Бородинской битвы.

К тому же, 14 сентября слонимский "Коммунальник" в домашней игре встречается с аутсайдером чемпионата "Осиповичами", что тоже отлично влилось бы в юбилейные мероприятия.

Так что перенос сроков празднования юбилея Слонима на неделю вперед лишил жителей и гостей города некоторых зрелищ.

Восполнить этот пробел призваны будут слонимские спортсмены.

Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНЫ

ПАДАРАЖЭЕ ПРАЕЗД У ЭЛЕКТРЫЧКАХ

З 1 верасня, магчыма, узрастуць цэны на праезд у электрычках.

Аб гэтым заявіла кіраўніцтва Беларускай чыгуначнай дарогі. Пасажыры за білеты на электрычку будуць плаціць на 6-8 % больш, чым раней.

РОСТ ЗЛАЧЫННАСЦІ НЕ СПЫНЯЕЦЦА

За сем месяцаў на Слонімшчыне колькасць злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку ўзрасла на 26,2 % у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года.

Не знізілася яна і ў суседніх са Слонімам раёнах. А, наадварот, на Зэльвеншчыне ўзрасла на 88,3 %, на Дзятлаўшчыне – на 15,4 %, на Мастоўшчыне – на 1,5 %, на Ваўкавышчыне – на 61,1 %.

ПАДРУЧНІКІ ГІСТОРЫІ АД СЛОНІМСКАГА НАСТАЎНІКА

Вучні 5-х, 6-х і 10-х класаў нашай рэспублікі з новага навучальнага года гісторыю Беларусі пачнуць вывучаць па падручніках нашага земляка.

Настаўнік Новадзевяткавіцкай сярэдняй школы Слонімскага раёна Васіль Ракуць і доктар гістарычных навук Георгій Штыхаў падрыхтавалі і напісалі падручнікі для школьнікаў Беларусі. Міністэрства адукацыі іх зацвердзіла, і цяпер новыя падручнікі паступаюць у школы рэспублікі.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЮБІЛЕЙ

СЛОНІМ АДЗНАЧЫЦЬ сваё 750-годдзе 6, 7 і 8 верасня



Фота Віталя ГІЛЯ

Да святочных мерапрыемстваў з нагоды 750-годдзя першага ўпамiну Слоніма ў Іпацьеўскім летапісе засталося крыху больш за два тыдні.

Поўным ходам ідуць падрыхтоўчыя работы да гэтага юбілею. Аднаўляецца цэнтр горада, стадыён, рынак. Кульмінацыйным цэнтрам усіх юбілейных мерапрыемстваў стане стадыён "Юнацтва" на вуліцы Пушкіна і Першамайская вуліца ў цэнтры горада. Менавіта тут 6, 7 і 8 верасня пройдуць усе культурна-масавыя мерапрыемствы. Да іх рыхтуюцца не толькі культасветработнікі нашага раёна і вобласці, але і школы, прамысловыя прадпрыемствы і творчая інтэлігенцыя. На святочныя мерапрыемствы будзе затрачана каля 30 мільёнаў рублёў.

Як адпачнуць слонімцы і што яны ўбачаць і пачуюць на працягу трох верасньскіх дзён? Плануецца, што 6 верасня ў РДК адбудзецца ўрачысты сход, пасля – канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці Слонімшчыны і танцавальнага калектыву Гродзенскага вучылішча мастацтваў.

7 верасня ў Жыровічах павінна адкрыцца выставачная зала Слонімскага краязнаўчага музея. У гэты дзень у 14 гадзін на стадыёне "Юнацтва" адбудзецца ўрачыстае адкрыццё юбілейнага свята ў выглядзе тэатральнага гістарычнага прадстаўлення. А ў 16-30 на летняй сцэне ў цэнтры горада, магчыма, выступіць беларускі ансамбль "Сябры", а таксама эстрадныя артысты Гродзенскай вобласці. У 20 гадзін у цэнтры горада пачнецца дыскатэка і канцэрт эстрадных спевакоў са Слоніма – Аляксандра Звяровіча, Вольгі Змуршчык, Алены Кананчук і Аляксандра Яфіміка. А ў 21 гадзіну слонімцы ў цэнтры горада ўбачаць святочны феерверк.

8 верасня ў 10 гадзін раніцы на Першамайскай вуліцы пачнецца канцэрт беларускага фальклору і раённае свята – дажынкі. А ў 11 гадзін гледачоў будуць вітаць фальклорныя калектывы Гродзенскай вобласці, сярод іх – "Лявоны"(Воранава), "Лідскае вяселле"(Ліда) і іншыя. Мяркуецца таксама выступленне ансамбля Белдзяржтэлерадыё "Бяседа".

Адначасова ў цэнтры Слоніма каля раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа адбудзецца выступленне пісьменнікаў-землякоў, у музеі – дзень адчыненых дзвярэй, каля ўнівермага – выступленне тэатра моды, у парку – свята дзяцінства і спорту і г.д.

Закрыццё святочных мерапрыемстваў мяркуецца ў нядзелю ў 16 гадзін. Але з 17 гадзін пачнецца масавыя гулянні слонімцаў у Альбярціне, на Энцы і на Брэсцкай вуліцы.

Як бачыце, запланавана шмат цікавага, каб гараджане і госці горада над Шчарай надоўга запомнілі юбілей свайго старажытнага горада. А як будзе на самой справе – пажывем пабачым.

Сяргей ЧЫГРЫН

ШКОЛА

ПЕРАД ПАЧАТКАМ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

Канчаецца лета. Да пачатку новага навучальнага года застаецца зусім мала часу. У школах ідзе падрыхтоўка да заняткаў. І, як паказала праверка Міністэрства аховы здароўя, не ўсё тут добра.

На прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра Мінздрава Беларусі Валерый Ключановіч паведаміў журналістам, што толькі 54% агульнаадукацыйных школ краіны былі падрыхтаваны да новага навучальнага года.

Як адзначаў намміністра, 45 працэнтам школ дазволена пачаць заняткі першага верасня ўмоўна. Гэта значыць, у бліжэйшы час у гэтых школах патрэбна закончыць рамонт памяшканняў, сантэхнічнага абсталявання, сістэмы асвятлення і харчовых блокаў.

У выніку праверак былі не атэставаны 48 працэнтаў агульнаадукацыйных школ рэспублікі. У іх забаронена праводзіць заняткі з-за аварыйнага стану памяшканняў, сістэмы водазабеспячэння і адсутнасці ацяплення.

Па словах Валерыя Ключановіча, каля 60 працэнтаў вучнёўскай мэблі ў школах патрэбна замяніць. Штучнае асвятленне не адпавядае санітарна-гігіенічным нормам у 18,2 працэнта школ. Забяспечанасць спартыўным інвентаром складае ўсяго 30 –40 працэнтаў, а спартыўныя залы ёсць у 93,3 працэнта школ. Акрамя таго, 70 працэнтаў школьных харчблокаў прызнаны непрыгоднымі да эксплуатацыі.

На мінулым тыдні загадчык аддзела адукацыі Слонімскага райвыканкама Галіна Шмялёва ў гутарцы з карэспандэнтам "ГС" сказала, што ў школах горада і раёна праведзены планавы рамонт і ў хуткім часе камісія павінна даць ацэнку ўзроўню падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года. Як адзначыла Галіна Іванаўна, такіх вялікіх недапрацовак, якія ў маштабах рэспублікі абазначыў намеснік міністра па ахове здароўя Валерый Ключановіч, у школах Слонімшчыны няма.

Адзначым таксама, што з новага навучальнага года агульнаадукацыйныя школы Беларусі пачнуць масавы пераход на пяцідзённы навучальны тыдзень.

У міністэрстве адукацыі бытуе думка, што гэта дазволіць вырашыць праблему вучэбных перагрузак школьнікаў і стварыць умовы для захавання здароўя дзяцей. Разам з тым, у сувязі з пераходам на пяцідзённы тыдзень, заняткі ў агульнаадукацыйных школах плануецца прадоўжыць да канца чэрвеня. Апрача школ з паглыбленым вывучэннем прадметаў, з эстэтычным і іншымі ўхіламі, а таксама гімназіі і ліцэі будуць па-ранейшаму працаваць шэсць дзён на тыдні.

Паралельна з пераходам на пяцідзённы тыдзень будзе перагледжана структура вучэбных планаў і зменены змест адукацыі. Акрамя таго, з першага верасня, у сувязі з перагрузкай вучэбных планаў, з іх будуць зняты некаторыя навучальныя дысцыпліны. Структура новых вучэбных планаў ужо распрацавана і прайшла экспертызу ў навуковай і педагагічнай грамадскасці.

У новым навучальным годзе 10-бальная сістэма ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў заменіць існуючую зараз сістэму. Да 2006 года мяркуецца ўвесці падагульняючае тэставанне ведаў школьнікаў на ўзроўні базавай школы, а да 2010 – на ўзроўні сярэдняй.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАМ ТЭЛЕФАНУЮЦЬ

ЯК ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ?

Менавіта з такім пытаннем звярнулася па тэлефоне ў "ГС" жывёлаводка калгаса імя Леніна Слонімскага раёна. Жанчына з вялікім адчаем паведаміла, што кіраўніцтва гаспадаркі не выплаціла людзям заробак яшчэ за травень.

– Надыходзіць новы навучальны год, а я вымушана буду малодшага сына адправіць у школу ў старых спартыўных нагавіцах, без сшыткаў, – гаворыць маці траіх дзяцей, якая не захацела назваць сваё прозвішча, бо баіцца рэпрэсій з боку начальства. – У чэрвені нашы даяркі страйкавалі з прычыны нявыплаты зарплаты, – працягвае яна, – панаехалі аграрныя чыны, але не для таго, каб нешта вырашыць. Наадварот, гэтыя мажныя мужчыны сталі страшыць людзей і пагражаць. І як след. Праз пэўны час мы даведаліся, што даяркам была зрэзана даплата за прырост прадукцыі і за якасць малака. А гэта, прыкладна, 20-30 тысяч рублёў.

Жанчына сказала, што яна перыядычна звяртаецца да розных чыноўнікаў раённага рангу, але ў адказ чула адно – грошай няма і невядома калі будуць.

Вяскоўка яшчэ спадзяецца на прэзідэнта, што, магчыма, ён нейкім чынам зможа паўплываць на сітуацыю.Таму яна папрасіла, каб рэдакцыя паведаміла адрас і тэлефоны адміністрацыі кіраўніка дзяржавы, бо ў райвыканкаме ёй адмовілі даць гэту інфармацыю.

Анатоль МІРСКІ

ЗДАРЭННІ

СЕЛА ПАПАЛІЦЬ

14 жніўня каля 22 гадзін з акна трэцяга паверха гатэля "Шчара" упала 35-гадовая прадпрымальніца з Віцебска. Яна трапіла на мармуровыя прыступкі каля дзвярэй гатэля, але не загінула.

Як пазней пацярпелая патлумачыла ўчастковаму міліцыянеру, яна села папаліць на падаконнік і падціснула пад сябе ногі. У гэты час закружылася галава і жанчына паляцела ўніз. На момант здарэння яна была ў нецвярозым стане.

Цяпер са шматлікімі траўмамі жанчына праходзіць курс лячэння ў Слонімскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Б'ЮЦЬ ПРОСТА НА ВУЛІЦЫ

Каля крамы "Лета" 17 жніўня незнаёмы мужчына без ніякай прычыны збіў сланімчаніна Х.

Цяпер работнікі міліцыі шукаюць вулічнага разбойніка, каб пачуць ад яго матывацыю такога ўчынку.

І ў той жа дзень каля рэстарана "Паланез" на Чырвонаармейскай вуліцы мясцовы жыхар ударыў сваю знаёмую.

Па гэтаму факту міліцыя праводзіць праверку.

КОНЬ НЕ ВЯРНУЎСЯ

У ноч з 7-га на 8-ае жніўня з фермы агратаварнага прадпрыемства "Шчара" прапаў конь.

Да апошняга моманту гаспадары спадзяваліся, што, магчыма, конь збег сам і павінен вярнуцца, калі нагуляецца на волі. Падобнае ўжо мела месца і раней.

Аднак на гэты раз конь не вярнуўся.

P.S. Калі ў кагосьці ёсць звесткі пра лёс прапажы, можаце падзяліцца імі па тэлефоне 02.

Мікола КАНАНОВІЧ


НАГОДА

УШАНАВАЛІ САЛДАТ ВОЙСКА ПОЛЬСКАГА

У чацвер, 15 жніўня, на Ружанскіх могілках у Слоніме адбылося ўрачыстае ўшанаванне салдат Войска Польскага, якія загінулі ў 1919–1920 гадах на тэрыторыі нашага горада.

Згодна гістарычных дадзеных, 14 студзеня 1919 года ў Слонім увайшлі часці Гродзенскага чырвонаармейскага рускага палка. І Слонімскі павет становіцца адзіным у Гродзенскай губерні, дзе пачынае дзейнічаць савецкая ўлада. У іншых рэгіёнах гаспадарамі былі палякі. Такое суседства не вельмі спрыяла бальшавікам і палякам. Апошнія з іх час ад часу пачалі наведвацца ў Слонім, а ў сакавіку 1919 года горад акружылі польскія кавалерыя, пяхота і захапілі Альбярцін, а пасля і Слонім. Праз год рускія войскі пад камандаваннем Тухачэўскага зноў выганяюць палякаў з горада. Падчас баёў былі ўзарваны масты, чыгунка, шмат палегла польскіх і рускіх салдат, а таксама мясцовых жыхароў.

Але не доўга бальшавікі гаспадарылі ў Слоніме, бо ў верасні 1920 года горад над Шчарай зноў перайшоў да палякаў і ўжо застаўся ў іх руках да верасня 1939 года. Сотні салдат Войска Польскага, якія загінулі ў гэтай бальшавіцка-польскай вайне, знайшлі свой апошні прытулак на Ружанскіх могілках у Слоніме.



Імшу ў гонар загінуўшых воінаў праводзіць гродзенскі ксёндз-біскуп Антоні Дзем'янка

Фота Віталя ГІЛЯ

Некалькі гадоў запар сябры Слонімскай суполкі Саюза палякаў на Беларусі аднаўлялі тэрыторыю пахавання польскіх воінаў на гэтых могілках. А калі месца было добраўпарадкавана, устанавілі мемарыяльны знак, на якім на беларускай і польскай мовах напісана: "У гонар салдат Войска Польскага, загінуўшых у 1919-1920 гадах. Суайчыннікі".

І вось на ўрачыстасць 2002 года сабралася шмат гараджан і гасцей. Сярод іх былі ветэраны Войска Польскага, прадстаўнікі Польскага пасольства і консульства ў Мінску і Гродне, дэпутаты Польскага Сейма, а таксама кіраўнікі Слонімскага райвыканкама і мясцовыя каталікі. Імшу ў гонар загінуўшых воінаў на Ружанскіх могілках правялі гродзенскі ксёндз-біскуп Антоні Дзем'янка, айцец Аляксандр і дэкан Слонімскага касцёла святога Андрэя Вітольд Жэльветра. У гэты дзень біскуп Антоні асвяціў магілы польскіх салдат.



Даніна памяці польскім салдатам на Ружанскіх могілках у Слоніме

Фота Віталя ГІЛЯ

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

НА КАРЫСЦЬ НАШАГА ГОРАДА

У РДК на мінулым тыдні адбылася прэзентацыя Слонімскага клуба грамадзянскіх ініцыятыў, у які ўвайшлі 9 мясцовых грамадскіх арганізацый і дзяржаўных устаноў.

Ініцыятыва мясцовых актывістаў была падтрымана амерыканскай праграмай "Альянс Партнёрства Каунтэрпарт".

За юрыдычную і фінансавую дзейнасць клуба адказвае грамадскае аб'яднанне "Воля да развіцця" у асобе дырэктара праекта Міхася Варанца. Старшынёй Слонімскага клуба грамадзянскіх ініцыятыў з'яўляецца Наталля Трус.

Акрамя сяброў слонімскіх грамадскіх арганізацый, што ўвайшлі ў клуб, у мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Каунтэрпарта і Слонімскага райвыканкама. У рамках праекта клуба грамадскія арганізацыі маюць намер каардынаваць свае намаганні ў вырашэнні як уласных задач, так і агульных мясцовых праблем у кантакце з дзяржаўнымі ўстановамі, мясцовымі СМІ, прадпрымальнікамі. Ва ўсякім разе, менавіта так былі акрэслены мэты стварэння гэтага альянсу.

Той факт, што на прэзентацыі клуба прысутнічаў намеснік старшыні Слонімскага райвыканкама Анатоль Цярэнін, паказвае на зацікаўленасць мясцовых уладаў да дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Дырэктар праекта Міхась Варанец у сваім выступленні адзначыў, што стварэнне клуба — гэта пераход ад колькасці да якасці ў працы трэцяга сектара Слонімшчыны, і выказаў спадзяванне, што работа клуба будзе напоўнена канкрэтнымі справамі і яго дзейнасць не скончыцца праз чатыры месяцы. У сваю чаргу Анатоль Цярэнін назваў стварэнне клуба добрай ініцыятывай, якая скіравана на карысць нашага горада, і ад імя выканкама блаславіў работу клуба на добрыя справы.



Падчас выступлення намесніка старшыні райвыканкама Анатоля Цярэніна

Фота Віталя ГІЛЯ

А спраў і праблем, якія патрабуюць вырашэння, у горадзе хапае. Гэта і праблемы хворых на цукровы дыябет, якія не маюць свайё спецыялізаванай крамы, і недахоп сацыяльных і медыцынскіх работнікаў у слонімскай арганізацыі Чырвонага Крыжа, праблемы інвалідаў і сталых людзей, занятасць моладзі і іншае, пра што ўзгадвалі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і госці на гэтай сустрэчы.

Што змогуць зрабіць удзельнікі Слонімскага клуба грамадзянскіх ініцыятыў для горада і для сваіх арганізацый — пакажа час.

У той жа дзень і назаўтра, 17 жніўня, трэнеры праграмы "Альянс Партнёрства Каунтэрпарт" Святлана і Вітаўт Рудзікі правялі з прадстаўнікамі арганізацый-партнёраў клуба трэнінг па напісанню заявак на малыя гранты праграмы Каунтэрпарт.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

СУСТРЭЧА ДЗЕЛЯ ПАРАЗУМЕННЯ

22 жніўня ў Слоніме адбудзецца "круглы стол", удзел у якім возьмуць прадстаўнікі мясцовых грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, партый, улады і прэсы.

Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць цэнтр "Давер" і МГА "Ветразь".

Мэта "круглага стала" — знаёмства грамадскіх арганізацый з уладамі Слоніма дзеля пошуку шляхоў да супрацоўніцтва, а таксама дзеля абмеркавання магчымага ўдзелу НГА Слонімшчыны ў падрыхтоўцы да святкавання 750-годдзя раённага цэнтра. Апроч гэтага, падчас сустрэчы прадстаўнікам мясцовага трэцяга сектару будзе прадстаўлена магчымасць прэзентаваць свае арганізацыі.

Як паведаміў старшыня МГА «Ветразь» А.Масюк, «галоўнае – каб мы зразумелі, што жывем на адной зямлі і нам трэба сябраваць і дзейнічаць разам, а не варагаваць».

Валерый РУСЕЛІК

НУ І НУ!

ХАТЫ ЗАПЛЫВАЮЦЬ БРУДАМ

Жыхары дома №31 па вуліцы "50 год БССР" у вёсцы Азярніца аказаліся закладнікамі каналізацыйна-вынасной станцыі, якая знаходзіцца ў двары іх дома і не працуе ўжо месяц.

Сцёкі нечыстотаў цякуць праз двор васьмікватэрнага дома і нават трапляюць у падвалы. Акрамя дома №31, да станцыі падключаны яшчэ10 двухкватэрных катэджаў і адзін чатырохкватэрны дом.

Сем'і Ракевічаў, Матлашукоў, Кандзірандаў, Башко, Тавачкаў, якія штодзённа вымушаны дыхаць смуродам і хадзіць па нечыстотах, маюць намер не плаціць за камунальныя паслугі, пакуль каналізацыйна-вынасная станцыя не будзе адрамантавана, а ў двары дома не навядуць парадак.

У размове з карэспандэнтам "ГС" адна з жыхарак сказала, што ў рабоце станцыі і раней здараліся непаладкі, але іх рана ці позна ліквідавалі калгасныя майстры, а тое, што адбываецца апошнім часам, далей проста немагчыма трываць.

Старшыня калгаса "Прагрэс" Мікалай Бусько канстатаваў той факт, што сваімі сіламі спецыялісты гаспадаркі не могуць правесці якасны рамонт. Каналізацыйна-вынасная станцыя, па словах Мікалая Аляксандравіча, даўно прагніла, і пасля ліквідацыі непаладак у адным месцы вельмі хутка нешта ламаецца ў іншым. Патрэбен капітальны рамонт, які павінна і абяцае зрабіць адпаведная служба са Слоніма, куды, дарэчы, і паступаюць камунальныя плацяжы жыхароў дома. А паколькі чакаць дапамогі слонімскіх камунальнікаў прыходзіцца доўга, то старшыня калгаса салідарны з жыхарамі дома №31 у іх нежаданні плаціць за камунальныя паслугі. Але людзям ад гэтага не лягчэй. Двор іх дома штодзённа заплывае нечыстотамі, і калі гэта скончыцца – невядома.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГРОДНА

"СПАДЧЫНА" АДНАВІЛА СВАЮ ПРАЦУ

У Гродне аднавіла сваю працу бібліятэка "Спадчына" пры мясцовым гарадскім аб'яднанні ветэранаў вайны, працы і ўзброеных сіл.

У бібліятэцы сабрана вялікая колькасць кніг на гістарычную тэматыку, творы нашых геніяльных суайчыннікаў – Васіля Быкава, Дануты Бічэль-Загнетавай. Бібліятэка працуе кожны аўторак і чацвер з 15.00 па адрасу: вул. Савецкая, 31-12.

Зміцер ЯГОРАЎ

БАРАНОВИЧИ

ЗАДЕРЖАН ГРАЖДАНИН РОССИИ С ГЕРОИНОМ

Сотрудники управления по Брестской области Комитета по борьбе с организованной преступностью и коррупцией совместно с УКГБ задержали в Барановичах крупную партию героина.

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе УВД Брестского облисполкома, на автозаправке "Белнефтехим" автодороги Кобрин – Столбцы, на выезде из Барановичей, при попытке сбыта 300 граммов героина был задержан житель Санкт-Петербурга 29-летний Зариф С. При обыске в "Тойоте", принадлежащей неработающему россиянину, было найдено еще 300 граммов героина, а также 4.800 американских долларов. В личных вещах задержанного оперативники нашли еще 2 грамма наркотика. Всего было изъято 602 грамма сильнодействующего наркотика.

По факту задержания наркотиков возбуждено уголовное дело.

Валентина КОЗЛОВИЧ

МАСТЫ

АБГАРЭЎ І ПАМЁР

Саракагадовы рабочы райспажыўгандлю пры нявысветленых абставінах абгарэў на рабочым месцы.

Ад атрыманых апёкаў мужчына памёр.

КАЛОДЗЕЖЫ ПУСЦЕЮЦЬ

У сувязі з сухім надвор'ем у многіх вёсках знікае з калодзежаў вада.


Акрамя гэтага перасохлі пажарныя вадаёмы на тэрыторыі раёна, а таксама арашальныя каналы. Нёман настолькі абмялеў, што кабета сталага ўзросту з вёскі Дашкаўцы пераходзіць яго ўброд, калі ідзе да сваякоў з вёскі Навасёлкі.

Антон МАКЕЙ

ІНТЭРВ'Ю

ПЕРАД ВЫБАРАМ

Вучаніца 11 класа гімназіі №1 г.Гродна Яўгенія Курбат прыехала да сваёй бабулі ў Слонім адпачыць перад пачаткам новага навучальнага года. Мінулы навучальны год Жэня правяла ў ЗША. Сёння карэспандэнт "ГС" гутарыць з ёй пра жыццё і вучобу моладзі ў нас і за мяжой.



Вучаніца 11 класа гімназіі №1 г.Гродна Яўгенія Курбат

— Жэня, раскажы крыху пра сябе і пра тое, як ты трапіла на вучобу ў Злучаныя Штаты.

— Я вучуся ў першай гродзенскай гімназіі. Гэта пакуль адзіная гімназія ў нашым горадзе. У мінулым годзе амерыканскія сенат і ўрад правялі адукацыйны конкурс для школьнікаў у былых савецкіх рэспубліках. Пераможцы гэтага конкурсу затым былі запрошаны на год павучыцца ў амерыканскіх школах. Я прыняла ўдзел у гэтай праграме і перамагла. З Беларусі ў Штаты на вучобу паехалі 50 чалавек, у тым ліку і я.

— І як табе там вучылася? Амерыканская праграма навучання істотна адрозніваецца ад нашай?

— Там вучань мае магчымасць выбіраць для навучання тыя прадметы, якія яго найбольш цікавяць, з арыентацыяй на будучую прафесію. Можа таму і вучыцца ў Амерыцы лягчэй, чым у нас. Хаця, у прынцыпе, хто хоча вучыцца, той добра вучыцца і ў нас, і ў іх. А наш стэрэатып пра амерыканскіх школьнікаў, што яны там у сваёй большасці тупыя і не хочуць вучыцца – зуім не адпавядае рэчаіснасці. Так, і там ёсць тупыя, абсалютна тупыя маладыя людзі, але іх не больш, чым у нас. І яшчэ наконт вучобы. У іх вучыцца цікавей, чым у нашых школах ці гімназіях. Напрыклад, хочаш зрабіць сваю вэб-старонку ў Інтэрнэце – калі ласка, прыйшоў, сеў за камп'ютэр і рабі. Хочаш зняць свой відэафільм, таксама няма праблем – бярэш відэакамеру, стужку і здымаеш колькі і што хочаш. Калі ў цябе ёсць нейкі праект, каб зрабіць штосьці карыснае ў школе, то дырэктар абавязкова пойдзе насустрач і знойдзе сродкі пад добрую справу.

— Канечне, іх тэхнічныя сродкі навучання і розныя дапаможнікі не параўнаць з нашымі, як і фінансаванне адукацыі наогул. Скажам, у Слоніме ў гарадскіх школах з бацькоў збіраюць грошы на рамонт. З гэтага боку любое параўнанне не будзе нам на карысць. Але акрамя матэрыяльнага боку ёсць іншы, на маю думку, не менш важны — узаемаадносіны паміж самімі вучнямі. Яны нечым адрозніваюцца ад узаемадачыненняў, скажам, паміж вамі ў гімназіі?

— Так, адрозніваюцца. І адразу скажу, што наш вучнёўскі асяродак мне падабаецца больш, чым іхні. У іх там усе вучні падзелены як бы на касты ці кланы. І калі ты ўваходзіш у нейкую адну групоўку, то ў іншую цябе ўжо не прымуць. Гэтыя вучнёўскія аб'яднанні бываюць папулярныя і непапулярныя. Але там маладыя людзі проста не могуць жыць без гэтай сваёй групоўкі, якая складаецца з 15 ці 20 чалавек. І яны ва ўсім адзін аднаго падтрымліваюць. У нас жа адносіны ў школе паміж вучнямі больш менш роўныя, сяброўскія.

— Жэня, праз год ты скончыш гімназію, атрымаеш сярэднюю адукацыю. І, уяві сабе, у цябе будзе выбар: вучыцца далей у Беларусі ці атрымаць вышэйшую адукацыю ў ЗША. Што б ты выбрала?

— Канешне, выбрала б Злучаныя Штаты.

— Чаму?

— Па-першае, таму, што там больш свабоды. І яшчэ, я ведаю, што са сваімі сіламі я тут нічога не здольная змяніць. І калі я, скажам, буду вучыцца ў Мінску ў лінгвістычным універсітэце і адкрыта выказваць свае думкі, то (самае меншае) мяне проста выкінуць адтуль.

— Вось як. У такім разе, што б ты пажадала сваім равеснікам, якія застануцца вучыцца ці працаваць у Беларусі і пры гэтым не будуць баяцца адкрыта выказваць свае думкі пра ўсё, што робіцца ў нашай краіне?

— Што пажадаць?.. Не здавацца. І каб на гэта ў іх хапіла сіл.

Гутарыў Мікола КАНАНОВІЧ

ЗЭЛЬВА

"ХАЙ ЗАШУМІЦЬ ХОЦЬ НА МАГІЛЕ МОЙ БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ СЬЦЯГ!.."

У Зэльве адбылося традыцыйнае святкаванне 92-ых угодкаў з дня народзінаў знакамітай беларускай паэткі Ларысы Геніюш. Як і раней, арганізаваў мерапрыемства старшыня мясцовай суполкі КХП БНФ Юрась Качук.

А 12-ай гадзіне ў царкве, якая стаіць амаль насупраць дома паэткі, адбылася імша. Прысутнічала каля 50-ці чалавек – з Гродна, Ліды, Ваўкавыска, Свіслачы, Слоніма, Мастоў, Мінска і інш. Цікава, што два гады таму ў гэтай



самай царкве была асвечана памятная шыльда, прысвечаная вельмі прыстойнай прыхажанцы Ларысе Геніюш. Рэч у тым, што гэта першая шыльда падобнага кшталту ў беларускіх праваслаўных цэрквах.

Затым людзі, што сабраліся тут, накіраваліся да могілак, дзе былі пахаваныя Ларыса Геніюш і яе муж. Пасля таго, як быў ускладзены вянок, адбылася грамадзянская паніхіда.

Людзі разам з групай слонімскіх уніятаў прачыталі малітву "Ойча наш", а напрыканцы прасьпявалі духоўны гімн беларусаў "Магутны Божа".

Завяршыла святкаванне нефармальная талака на маляўнічым беразе Зэльвенскага водасховішча. Тут перад прысутнымі выступілі мясцовы бард Валеры Жамойцін і гродзенскі музыка Алесь Петрашэвіч.

Валера РУСЕЛІК

МАСТЫ

АДШУКАЛІ ПА ТРОХ МІЛІМЕТРАХ

У Мастах на вуліцы Станцыённай адбыўся начны наезд на пешахода. Парушальнік з месца здарэння ўцёк.

Пацярпеўшы не змог запомніць нумар машыны, а на месцы наезду засталіся толькі рэшткі разбітай фары ды невялікі кавалачак пакраскі ў 3-4 міліметры і болей ніякіх улік. Да гонару супрацоўнікаў Мастоўскага ДАІ парушальнік хутка быў выяўлены.

ВАКАНТНЫХ МЕСЦАЎ НЯМА

Набліжаецца капанне бульбы. У сувязі з засушлівым надвор'ем мяркуецца нізкі ўраджай другога хлеба на Беларусі.

Многія мастаўчане штогод у гэтую пару бралі водпуск і праз бюро працаўладкавання ездзілі дапамагаць калгасам і заадно рабілі сабе запас бульбы на зіму. Сёлета калгасы не замаўляюць брыгады гараджан на дапамогу, і таму перад многімі мастаўчанамі паўстала праблема: дзе здабыць бульбу.

МІЛІЦЫЯ ЗАЦІКАВІЛАСЯ ГУСКАЮ

Пасля таго як "ГС" распавядала аб тым, што ў вёсцы Дзенькаўцы ў сям'і Лапатаў жыве дваццацідвухгадовая гуска, птушка стала знакамітай на ўсю Беларусь.

Напачатку пра яе распавяла "Камсамольская праўда". Затым прыехалі работнікі Гродзенскага тэлебачання ды знялі пра яе матэрыял і паказалі па Беларускім тэлебачанні. Зараз даўгалецем гускі зацікавіліся супрацоўнікі "Міліцэйскага весніка" і завіталі ў вёску.

МАЛАКО ТАННЕЕ

На тэрыторыі Правамастоўскага сельсавета зніжаны закупачны кошт малака ад насельніцтва.

Напачатку года ён складаў 220 рублёў за літр, вясной перапрацоўчы завод знізіў яго да 200 рублёў, а зараз за здадзены літр плоцяць усяго 150 рублёў. Здаваць малако дзяржаве стала не выгадна.

У КВІТАНЦЫІ ПАЗНАЧАЮЦЬ УСЁ

У сувязі з тым, што ў вёсцы Лунна ў краме спажывецкай кааперацыі не працуе касавы апарат, прадаўцы на кожнага пакупніка за набыты тавар мусяць выпісваць квітанцыю.

У квітанцыі ўказваецца прозвішча пакупніка, адрас і набытыім тавар. Такая дакладнасць здзіўляе мястачкоўцаў, а яшчэ болей – гасцей, якім іншы раз неабходна набыць пачак запалак.

Антон МАКЕЙ

СЛОНІМ

ГІСТОРЫЯ ХУТАРОЎ ГАРАДЗІШЧА

У мінулым нумары на старонках нашай газеты быў змешчаны нарыс "Хутары без хутаранцаў". Свой працяг гэтая тэма знайшла ў лісце сланімчаніна Івана Крынчыка, які расказвае пра гісторыю хутароў Гарадзішча на Слонімшчыне.

Некалькі стагоддзяў таму паміж вёскамі Ніз і Едначы быў фальварак Гарадзішча. Ён адносіўся да маёнтка Парэчча і належаў Казіміру Валовічу. У той час у фальварку працавала смольня. Назва фальварка паходзіць ад старадаўняга ўмацавання, насып якога захаваўся да сённяшняга часу.

За ўдзел у паўстанні 1830-ых гадоў бацькі і сына Казіміра і Міхала Валовічаў фальварак быў канфіскаваны на карысць расійскай казны. Пасля адмены прыгоннага права ўладальнікам фальварка стаў жыхар вёскі Гарадкі Калістрат Гародка. Пазней фальварак быў падзелены паміж яго сынамі Янам, Калістратам і Браніславам.

У пачатку мінулага стагоддзя надзел Яна быў прададзены за запазычанасць з таргоў. Яго купіў жыхар вёскі Ламашы Максім Свярэпік.

Гаспадарку Калістрата набыў жыхар вёскі Едначы Вінцэсь Крынчык.

Падчас Першай сусветнай вайны, у 1915 годзе, жыхары хутароў пакінулі свае дамы, а будынкі былі спаленыя. Пасля падпісання Рыжскага міру ўцалелыя жыхары вярнуліся і аднавілі пабудовы. У той час зямлю трэцяга Гародкі, Браніслава, купіў жыхар вёскі Азгінавічы Вацлаў Каспаровіч, але з-за хваробы гаспадарку ўладкаваць і хутка здаў свой хутар у арэнду Васілю Свабодзе. А надзел каля гары купіў жыхар Нізоў Якаў Зенька.

У 1932 годзе каля хутароў было пабудавана абаронча збудаванне – Шлюз. Хутары Свярэпікаў пачалі называцца Гарадзішча – Янава, а потым проста Янава.

Перад Другой сусветнай вайной жыхары хутароў многа працавалі і жылі адносна нядрэнна, але заможнымі не былі. У сямі дамах на хутарах пражывала каля пяцідзесяці чалавек.

Падчас вайны многія хутаранцы загінулі, некаторых лёс раскідаў па свеце. Вялікія страты пацярпелі гаспадаркі. У 1942 годзе Іван Юшко арганізаваў на хутарах першы партызанскі атрад на поўначы Слонімшчыны.

У пасляваенны час моладзь паступова пакідала родныя гнёзды. Пасля арганізацыі калгасаў жыхары пачалі перасяляцца з хутароў у навакольныя вёскі.

У 1987 годзе апошнія жыхары пакінулі свае хутары. Цяпер палі там засаджаны лесам, перасталі выкарчоўвацца і зарастаюць хмызнякамі сенажаці. І толькі рэшткі падмуркаў і здзічэлая садавіна нагадваюць пра былое чалавечае жытло. Ды стаіць на месцы аднаго з хутароў хатка паляўнічых.

Іван КРЫНЧЫК

ДЗЯТЛАВА

ПАМЕРЛА Ў СТАЛОВАЙ ШКОЛЫ-ІНТЭРНАТА

Жыхарка Дзятлава, грамадзянка Н., пайшла ў сталовую школы-інтэрната, каб падрыхтаваць залу для вяселля свайго сына, якое мелася адбыцца ў мінулую пятніцу, і раптоўна памерла.

Як сказалі медыкі, у жанчыны здало сэрца. А было ёй усяго пяцьдзесят гадоў.

ДЗЯЎЧЫНУ ЗАБІЛА ТОКАМ

18-гадовая грамадзянка В. з Дзятлаўскага раёна прыехала да бабулі з дзядулем у вёску пагасцідь.

Вечарам, пасля дыскатэкі, яна пайшла да калодзежа памыць ногі, уключыла электрычную помпу, якой качалі ваду, і ўпала замертва. Яе паразіла токам.

ЗАДЫХНУЎСЯ Ў ДЫМЕ

На хутары ля вёскі Курпяшы Дзятлаўскага раёна адбыўся пажар. У дыме задыхнуўся 35-гадовы гаспадар, грамадзянін Т.

Ён працаваў жывёлаводам у мясцовым калгасе "Расія".

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

МАСТЫ

ЗВАЛКА СТАЛА ПРЫЧЫНАЮ ПАЖАРУ

На звалцы ААТ "Мастоўдрэў" ля вёскі Галынка адбыўся пажар, ад яго загарэўся бліжэйшы лес.

Страты маглі быць значныя, але падаспелі рабочыя Мастоўскага лясніцтва і патушылі агонь.

Выгарала прыкладна тры гектары лесу.

Антон МАКЕЙ

ВОЛКОВЫСК

НЕ ПОНРАВИЛСЯ РЕДАКТОР

На прошлой неделе наряд милиции доставил в дежурную часть редактора волковысской "Местной газеты" Андрея Поверского.

В тот злополучный вечер он вместе с приятелем отмечал свой день рождения в "Экспресс-баре". Двое изрядно накачавшихся посетителей стали приставать к имениннику, навязывая драку.

Прибывшие дежурные милиционеры неожиданно придали делу обратный оборот. Они доставили редактора в больницу на освидетельствование, а затем отвезли в отдел милиции и составили протокол, после чего газетчика отпустили.

Александр ДАНИЛИН

ГРОДНО

МАРКЕВИЧУ И МОЖЕЙКО
снижены сроки наказания

В Гродненском областном суде, 15 августа, состоялось рассмотрение кассационной жалобы редактора закрытой газеты "Пагоня" Николая Маркевича и журналиста Павла Можейко.



Николай Маркевич (справа) и Павел Можейко отвечают на вопросы журналистов

Судебная коллегия по уголовным делам под председательством Александра Корзуна оставила без изменений приговор в отношении Маркевича и Можейко, а их жалобу — без удовлетворения.

Как известно, Маркевич и Можейко были признаны виновными в клевете в отношении президента (часть 2 статьи 367 Уголовного кодекса) судом Ленинского района Гродно и приговорены соответственно к 2 годам 6 месяцам и 2 годам ограничения свободы (так называемая "химия").

Судебная коллегия, оставив без изменений приговор, применила пункт 9 закона об амнистии и снизила сроки наказания на один год.

Сразу же после суда в Гродно состоялась пресс-конференция Можейко, Маркевича, а также руководителя Центра защиты прав журналистов при Белорусской ассоциации журналистов Михаила Пастухова, первого заместителя председателя Белорусского Хельсинкского комитета Гарри Погоняйло и адвоката Александра Берилова.

Михаил Пастухов отметил, что осуждение Маркевича и Можейко — это первый случай в послевоенной Европе, когда к уголовной ответственности привлекаются журналисты. В странах СНГ, сказал он, подобной практики придерживаются только Туркменистан и Казахстан, и то, в Казахстане подобное уголовное дело лишь возбуждено, осужденных пока не было.

Известный адвокат и правозащитник Гарри Погоняйло отметил, что и в цивилизованных демократических государствах существуют конфликты между журналистами и властью, однако там все споры объективно решает суд. "У нас же это невозможно, — сказал адвокат. — Сегодняшний суд показал, что чиновник в Беларуси всегда прав. В Беларуси создано жесткое тоталитарное государство".

Стоит отметить, что английский ПЕН-центр избрал гродненских журналистов Николая Маркевича и Павла Можейко почетными членами своей организации.

Комментируя БелаПАН решение английского ПЕН-центра, Николай Маркевич отметил: ему очень приятно, что есть люди, для которых солидарность — не пустой звук. "Это придает оптимизм и надежду, что белорусские власти, которые управляют страной по законам прошлого века и даже средневековья, уйдут в прошлое... Самое темное время — перед рассветом", — сказал Маркевич.

БелаПАН

ГРОДНА

У ГРОДНЕ ВЫСТАЎЛЯЕЦЦА ВАСКОВАЯ ПОСТАЦЬ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

На ганку гродзенскага Дома афіцэраў стаіць нерухомая фігура Юрыя Гагарына. Заваблівае гараджанаў на выставу з Санкт-Пецярбургскага музея васковых постацяў.

Назва выставы – "Расія ўчора... Сёння?.. Заўтра???". "З Лукашэнкам А.Р.", – даволі двухсэнсоўна дапісана на вулічнай афішы. У васковай галерэі два Леніны: адзін — на трыбуне, другі — у труне, у маўзалеі. Ёсць чэкіст у чорнай скураной вопратцы.

Далей — Берыя, генсекі ЦК КПСС. А таксама замежнікі — Маа-Дзэдун і Фідэль Кастра. Апошнімі стаяць Ельцын, Пуцін і Лукашэнка. Самыя новыя экспанаты — Ленін у маўзалеі і беларускі кіраўнік дзяржавы. Наведвальнікі ўспрымаюць выставу па-рознаму. Нярэдка — негатыўна.

Менеджэр Юлія Аўсянкіна тлумачыць, што больш дакладна яна называецца "Правадыры і прэзідэнты". Па яе словах, дадалі сцэну маўзалею, гэта зроблена зусім нядаўна, гэта першая работа такая. Лукашэнка літаральна зроблена тры тыдні таму. Гэта першая і пакуль адзіная фігура прэзідэнта Беларусі.

На жаль, якіх-небудзь падрабязнасцяў вырабу постаці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь яна не ведае. Аўсянкіна сказала, што ведае толькі, што рабілі яе вельмі доўга, дзесьці паўтара года. Фігура зробленая паводле кіна-фотаматэрыялаў. І, прыблізна, двухгадовай даўніны прэзідэнт Беларусі тут і стаіць. Аляксандра Лукашэнку пастанавілі зрабіць з воску яшчэ 5 гадоў таму для кампазіцыі "прэзідэнты краінаў СНД".

Прадстаўнік піцерскага музея сказаў, што ўзніклі праблемы толькі з кіраўніком Беларусі. У прэзідэнцкай адміністрацыі адмовіліся паведаміць дадзеныя наконт памераў ягонага адзення і абутку, ды іншыя падрабязнасці. Хаця некаторыя прэзідэнты для такой мэты не шкадавалі нават сваіх гарнітураў і гальштукаў. Адзіны палітычны дзеяч, які стаіць сёння на выставе без подпісу, — гэта зноў-такі Аляксандр Лукашэнка. Не паспелі зрабіць шыльдачку. Але наведвальнікі яго пазнаюць адразу. Хаця фатаграфуюцца часцей за ўсё побач з Пуціным. З Лукашэнкам — некаторыя не жадаюць, а хто-ніхто і пабойваецца, — зазначае абслуга выставы.

Радыё СВАБОДА

ВОЛКОВЫСК

ЗАДАЧИ РЕШАЮТСЯ, А ПРОБЛЕМЫ ОСТАЮТСЯ

В районном исполнительном комитете состоялось расширенное заседание по итогам работы за 1-е полугодие текущего года.

Председатель местного райисполкома Михаил Савельев обратил внимание на то, что несмотря на перевыполнение прогнозных показателей, район имеет большие задолженности по выплатам в бюджет. К примеру, Росский комбикормовый завод только на 66% осваивает производственные мощности и несвоевременно вносит платежи в бюджет.

Основными причинами этого, отметил директор завода Виктор Аскерко, являются отсутствие спроса на продукцию и задержки с расчетом за нее. Не лучшим образом состоят дела в колхозе "Родина". По словам председателя Юрия Кухтюка, положение можно поправить, если увеличить объем производства и улучшить качество кормов.

ПОМОЩЬ ИНВАЛИДАМ ИЗ ГЕРМАНИИ

В гостях у районного общества инвалидов побывали представители католической церкви немецкого города Бернбурга. Они ознакомились с тем, как живут инвалиды, какую помощь им оказывает общественная организация.

По сообщению председателя общества Людмилы Мухиной, после знакомства гости из Германии передали 20 новых инвалидных колясок, которые были безвозмездно переданы инвалидам с нарушением опорно-двигательного аппарата.

НА ПРАЗДНИК – В СЛОНИМ

В праздничной программе, посвященной 750-летию Слонима, примет участие и Волковысский театр моды "Спадчына".

По словам руководителя театра Аллы Сурминовой, жители города и района смогут познакомиться с новой коллекцией соломенных нарядов "Сударушки".

НЕ ХВАТИЛО ОПЫТА

В час ночи 19-летний водитель автомобиля "VW-Гольф", управляя личной автомашиной по ул. Софьи Панковой, не справился с управлением и выехал на тротуар, где столкнулся со световой опорой.

В результате аварии несовершеннолетний пассажир получил телесные повреждения и был доставлен в реанимацию местной больницы.

Александр ДАНИЛИН

СЛОНИМ

КУДА НЕ ЗАГЛЯНЕШЬ – ВЕЗДЕ ОДНИ ПРОБЛЕМЫ

Недавно депутаты местного райсовета Михаил Сидоров, Виктор Герасимчик и главный редактор газеты "Товарищ" Сергей Возняк посетили ряд деревень Костровичского и Озерницкого сельских советов Слонимского района.

Как выяснилось, наиболее остро для жителей д.Костровичи стоит вопрос телефонизации населённого пункта. По заверениям сельчан, они уже были обмануты в своих ожиданиях, когда несколько лет назад внесли положенную оплату для установки им телефонов. Но прошло время, и телефонов очередники не дождались, правда, деньги, хотя и обесцененные, им всё же вернули. Где гарантия,что подобное не повторится в очередной раз? – справедливо спрашивали люди.

Там же, в Костровичах, был поднят вопрос и о газификации второй половины улицы за сельским клубом. Жители других населённых пунктов высказывали недовольство режимом работы магазинов, графиком завоза продуктов и, в первую очередь, хлебобулочных изделий, их качеством. Большинство родителей тревожились, что с началам нового учебного года их дети будут добираться в школу пешком. Например, малышам деревни Байки придётся одолеть в непогоду шесть километров в обе стороны, чтобы получить образование.

По всем поднятым вопросам депутаты подготовят запросы в соответствующие инстанции.

P.S. Пока готовился данный материал к публикации, на официальный запрос, поднятый по поводу телефонизации деревни Костровичи, подготовленный депутатом райсовета Виктором Герасимчиком, на его имя пришёл ответ начальника Слонимского районного узла электросвязи С. Карачарова, в котором говорится, что «телефонизация д. Костровичи включена в план расширения телефонной сети Слонимского района на 2003 год, проектная документация имеется». Один вопрос, кажется, решён. Осталось только дождаться начала работ.

Виктор ФЕДОРОВИЧ

ЭКОНОМИКА

ПОДНЯЛИСЬ ЦЕНЫ НА БЕЛУЮ ВОДКУ

В Беларуси произошло восьмое в нынешнем году повышение цен на белую водку.

Как и в июле, оно составило 4 процента, что связано с ростом курса евро к белорусскому рублю.

Теперь в розничной продаже, например, пол-литровая "винтовая" бутылка водки "Кристалл-100" стоит 2.555 рублей (ранее — 2.460), "Белая Русь", "Кристалл-люкс" — 2.640 (2.540), "Белая Русь-люкс", "Кристалл-люкс новый" — 2.735 (2.635). Однако, необходимо отметить, что водку под такими названиями сейчас очень трудно найти в магазинах: минский завод "Кристалл" приостановил ее выпуск по причине убыточности. По словам представителя завода, акцизы росли быстрее, чем отпускные цены на водку. Сейчас курс евро стабилизировался и даже несколько снизился, поэтому на заводе надеются в скором времени возобновить производство этой водки. Всего, с начала года, водка подорожала на 25,4 процента.

Дмитрий ВЛАСОВ

ЦЕНЫ НА ЭНЕРГОНОСИТЕЛИ ДЛЯ БЕЛАРУСИ МОГУТ ВЫРАСТИ

Присоединение России к Всемирной торговой организации (ВТО) может привести к повышению цен на энергоносители для Беларуси.

Об этом заявил на недавней пресс-конференции в Минске начальник управления внешних связей Министерства промышленности Беларуси Николай Стародынов.

Сейчас, отметил он, в отношении России выдвигаются требования доступа на ее внутренний рынок иностранных поставщиков энергоносителей. В данном случае России придется продавать энергоносители на своем внутреннем рынке по мировым ценам.

По словам Стародынова, это приведет к тяжелым последствиям для Беларуси, которая, находясь в едином таможенном пространстве с Россией, приобретает энергоносители по внутрироссийским ценам, что существенно ниже мировых цен. Продукция многих предприятий в этом случае окажется неконкурентоспособной, так как энергетическая составляющая в себестоимости резко возрастет. В подобном положении окажутся и российские предприятия.

Россия неоднократно заявляла о том, что не согласна выполнять такие требования ВТО, так как считает их завышенными. Однако представители ВТО продолжают настаивать на доступе иностранных поставщиков энергоносителей на российский рынок.

БелаПАН

БАНКИ БУДУТ ИНФОРМИРОВАТЬ НАЛОГОВЫЕ ОРГАНЫ

С 1 сентября белорусские банки и отделения связи будут отслеживать получение гражданами сумм доходов из-за границы и информировать об этом налоговые органы.

Как сообщил 14 августа на пресс-конференции в Минске заместитель министра по налогам и сборам Александр Дорошенко, эта мера предусмотрена новыми шагами по обеспечению своевременной уплаты подоходного налога, утвержденными декретом президента № 19 от 6 августа, который вступит в силу 1 сентября. По словам Дорошенко, налоговые органы будут использовать такие банковские сведения для контроля за своевременным заполнением и представлением гражданами деклараций о доходах, правильностью исчисления подоходного налога и своевременностью перечисления его в бюджет. Информация будет предоставляться, в том числе, о средствах, которые перечисляются из-за рубежа по международным системам быстрых денежных переводов, таким как, например, "Western Union".

Эти меры, как заявил замминистра, позволят "защитить интересы физических лиц" от применения к ним мер административной и финансовой ответственности. Незнание налогового законодательства, пояснил Дорошенко, не дает возможности лицам, которые эпизодически получают доходы из-за границы, своевременно представлять декларацию о доходах. Соответственно, после выявления данных фактов налоговая инспекция приглашает этих граждан к себе, составляя протоколы об административной и экономической ответственности. "Отсюда возникают обоснованные и необоснованные жалобы физических лиц", — подчеркнул Дорошенко.

БелаПАН

ПРАВИТЕЛЬСТВО СНИЗИТ НАЛОГИ

В 2003 году правительство намерено продолжить снижение налоговой нагрузки на предприятия. Об этом свидетельствуют прогнозные данные, заложенные в проект основных направлений бюджетно-налоговой политики на 2003 год.

В частности, предполагается снизить с 2 до 1,5 процента уплачиваемые единым платежом отчисления в республиканский фонд поддержки производителей сельскохозяйственной продукции, продовольствия и налог с пользователей автомобильными дорогами в дорожные фонды.

С 2,5 до 1,9 процента правительство намерено сократить уплачиваемые единым платежом целевые сборы на формирование местных бюджетных фондов стабилизации экономики и производителей сельскохозяйственной продукции и продовольствия, целевых бюджетных жилищно-инвестиционных фондов и целевого сбора на финансирование расходов, связанных с содержанием и ремонтом жилищного фонда.

С 5 до 3,75 процента планируется снизить чрезвычайный налог и отчисления в фонд содействия занятости, а также сократить с 15 до 6 процентов ставку налога на дивиденды и приравненные к ним доходы.

Планируется, что предельные ставки по целевым сборам не будут превышать 5 процентов от суммы прибыли, остающейся в распоряжении юридического лица.


Проектом предусматривается, что средняя заработная плата работников бюджетной сферы в 2003 году составит 125 долларов.

БелаПАН

ЭКОНОМИКА

СОКРАТЯТ РЯД СОЦИАЛЬНЫХ ЛЬГОТ

В 2003 году в Беларуси планируется сократить ряд социальных льгот. Такие меры предлагаются в проекте основных направлений бюджетно-налоговой политики на 2003 год.



Столько рублей, что рук не хватает их пересчитать

Как указывается в проекте, это будет сделано "для приведения в соответствие социальных обязательств государства с экономическими возможностями и повышения уровня социальной защищенности малообеспеченных граждан".

С этой целью уже подготовлены поправки в законы "О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС", "О статусе Героя Советского Союза, Героя Социалистического труда, полных кавалеров орденов Славы, Трудовой Славы", "О статусе военнослужащих" и другие нормативные акты.

Под сокращение подпадут льготы по оплате за жилье и коммунальные услуги, услуги связи, льготы на бесплатное получение лекарств, санаторно-курортное лечение, проезд в общественном пассажирском транспорте. Кроме того, будет изменен порядок их представления.

Сокращение доли бюджетного финансирования на предприятиях транспорта будет рассматриваться в комплексе с отменой льгот на проезд отдельным категориям граждан. Предполагается, что в регионах пассажиры будут оплачивать 75 процентов стоимости поездки, в Минске — 50 процентов.

Сокращение льгот с одновременным повышением оплаты за услуги будет происходить и в коммунальной сфере. Планируется, что в будущем году граждане будут оплачивать не менее 60 процентов от себестоимости затрат жилищно-коммунальных служб.

В 2003 году планируется расширить и спектр платных медицинских услуг. Они должны составить не менее 35 процентов от общего объема финансирования отрасли.

БелаПАН

ЭКОНОМИКА

МИНСКИЙ АВТОЗАВОД ПРЕДСТАВИТ В МОСКВЕ НОВЫЕ РАЗРАБОТКИ

В ходе крупнейшей российской международной автомобильной выставки "МИМС-2002", которая пройдет в Москве с 21 по 25 августа, Минский автомобильный завод представит только новые разработки.



Эти МАЗы недавно сошли с конвейера

Как сообщил БелаПАН технический директор МАЗа Александр Ракомсин, седельные тягачи на "МИМС-2002" будут представлены моделью МАЗ 5440-03 для местных и региональных перевозок. Это седельный тягач нового поколения с колесной формулой 4х2, оборудован кабиной с короткой и низкой крышей, двигателем "Евро-2" Ярославского моторного завода мощностью 250 лошадиных сил.

Еще одна новинка — новая версия популярного самосвала МАЗ-5551. Он также оборудован двигателем стандарта "Евро-2". Главная отличительная особенность этой машины состоит в том, что самосвал рекомендуется к использованию в составе автопоезда с прицепом нового поколения, с боковой разгрузкой грузоподъемностью 10.600 кг. Соответственно автомобиль оборудован сцепным устройством.

БелаПАН

ВНИМАНИЕ!
В *«Газеце Слонімскай»*
действуют следующие цены на рекламные услуги:
- Строчная (частная) реклама — **3050 руб.**
- Поздравление — **4310 руб.**
- Поздравление с фото — **4690 руб.**
- Соболезнование, благодарность — **2630 руб.**
- Модульная реклама — 1 кв.см — **813 руб**
- Дополнительная плата взимается ЗА СРОЧНОСТЬ **+ 1000 руб;**
- Поздравление В РАМОЧКЕ **+ 1000 руб;**
- Реклама, выделенная ЦВЕТОМ, **+ 30%** от стоимости;
- Реклама на 1 и 16 стр. **+ 50%** от базовой стоимости;
- Частная реклама С ФОТО — **5000 руб**
- Вашу рекламу мы также можем разместить в Интернете. Эта услуга стоит **+ 20%**

В нашей газете могут поместить поздравление или рекламу жители соседних регионов. Для этого необходимо оплатить стоимость заказанного объявления на наш

р/с 3013215550011 в АСБ «Беларусбанк», ф. 422 в г. Слониме, код 852 УНН 590079996

и отправить текст вместе с квитанцией по адресу:
231800, г. Слоним Гродненской области, ул. Комсомольская, 8, «Газета Слонімская» или по факсу 2-49-39.
Последний срок подачи заявлений на публикацию в текущий номер —
понедельник 18.00.

Невеста
Слоним, пл. Ленина, 11
Тел. 4-20-03
Новая коллекция
Европейский стиль и качество. Уникальные дизайнерские и конструкторские разработки. Широкий ассортимент в наличии и под заказ. Прокат свадебных и вечерних нарядов, бальных детских платьев, мужских костюмов.
Лиц. БбС №5698, 10.05.00-10.05.05.

Тел. **2-14-02** (10.00-18.00)
2-19-88 (вечером)
Салон **«Джессика»**
ЭЛИТНАЯ КОЛЛЕКЦИЯ
Прокат свадебной, вечерней одежды, мужских костюмов (смокингов) пр-ва фирм Европы и Америки.
Роскошные подвенечные платья со шлейфами
